■ Духоўнасць

АНДРЭЕЎСКІ КРЫЖ

У ПЕРШЫЯ ДВА ДНІ ПАКЛАНІЦЦА КРЫЖУ АПОСТАЛА АНДРЭЯ Ў МІНСКУ ПРЫЙШЛІ ДЗЯСЯТКІ ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК

Што рухае людзьмі, якія гатовы гадзінамі стаяць у чарзе, каб пакланіцца святыні? Набожнасць? Змірэнне? Спадзяванне на цуд? Напэўна, і першае, і другое, і трэцяе. А яшчэ здзіўленне перад сілай веры пакутнікаў, жаданне пераняць хаця б частку іх вопыту любові да Бога і блізкіх.

«Вядома, што хрысціянская Царква заўсёды шанавала і дагэтуль шануе мошчы святых, а таксама святыя прадметы, якія мелі дачыненне да іх жыцця і, вядома ж, да іх пакутніцкай смерці, — сказана ў інфармацыі Патрскай мітраполіі, з якой у Расію, Украіну і Беларусь быў дастаўлены Крыж Андрэя Першазванага. — Шануючы святыя прадметы, Царква набожна памінае святога і яго пакутніцтва. Прадметы, звязаныя з жыццём святога, дзякуючы непасрэднай блізкасці да яго, атрымалі асаблівы дар ад Бога. Гэта пацвярджаецца і тым фактам, што праз іх Бог стагоддзямі здзяйсняе для вернікаў мноства цудаў».

У першую ноч знаходжання на Беларусі Крыж, на якім прыняў смерць апостал Андрэй, быў прынесены ў Мінскі Свята-Андрэеўскі храм (мікраараён Серабранка). «Ён пабываў у Доме сваім», — лічаць прыхаджане царквы. Некаторыя паломнікі пачалі займаць чаргу апоўдні папярэдняга дня і прастаялі больш за 12 гадзін, чакаючы святыню. З апоўначы, калі адчыніліся дзверы храма, і да 5 гадзін раніцы да Крыжа, па словах супрацоўнікаў міліцыі, падышлі 20-30 тысяч чалавек. Пасля паток вернікаў значна скарацціўся, і да 10 гадзін, пакуль Крыж знаходзіўся ў храме, пакланіцца хрысціянскай рэліквіі можна было практычна свабодна. Адзін з банераў каля ўвахода паведамляў, што ўсе ахвяраванні паломнікаў пойдуць на завяршэнне другой чаргі будаўніцтва нядзельнай школы.

У другой палове дня 29 ліпеня Крыж святога Андрэя быў прынесены ва Усясвяцкі храм на скрыжаванні вуліц Усіхсвяцкай і Каліноўскага. Да апоўдня наступнага дня сюды, па словах служыцеляў храма, пакланіцца Крыжу прыйшло каля 40 тысяч вернікаў. 30 ліпеня ўдзень стаянне ў чарзе доўжылася каля 4,5 гадзін.

Крыж святога апостала Андрэя для таго, каб прыбыць на нашы землі, упершыню пакінуў не толькі межы грэчаскага горада Патры, але і Сабор, дзе ён знаходзіўся з 1980 года.

— Гэта адбылося дзякуючы волі Госпада і малітвам апостала Андрэя для таго, каб блаславіць нашчадкаў старажытнай Русі, — сказаў журналістам мітрапаліт Патрскі Хрызастом, які суправаджае святыню ў яе падарожжы па Расіі, Украіне і Беларусі. — Эладская Царква і Патрская Мітраполія атрымалі просьбу аб прынясенні Крыжа на гэтыя землі ў дні святкавання 1025-годдзя Хрышчэння Русі. Хрышчэнне гэта адбылося па жаданні князя Уладзіміра, але здзейсніла яго візантыйскае духавенства, таму паміж нашымі народамі існуюць вельмі глыбокія духоўныя сувязі. Гэтыя сувязі яшчэ больш умацоўваюцца з прыбыццём Крыжа апостала Андрэя на землі трох славянскіх народаў.

Уладыка Хрызастом прызнаўся, што вельмі кранутыя набожнасцю людзей, якія прыходзяць пакланіцца Крыжу, і запрасіў усіх таксама наведаць Сабор святога Андрэя ў горадзе Патры (Грэцыя), дзе захоўваецца таксама галава апостала.

У Расіі, па словах старшыні сінадальнага інфармацыйнага аддзела Рускай Праваслаўнай Царквы Уладзіміра Лягойды, да Крыжа святога Андрэя падышло каля паўмільёна чалавек.

Менавіта ў горадзе Патры апостал Андрэй пражыў апошнія гады свайго жыцця і прыняў пакутніцкую смерць. Першы вучань Хрыста сабраў тут вялікую хрысціянскую абшчыну і здзейсніў шмат цудаў. 30 лістапада 70 года праконсул Эгеат загадаў распяць Андрэя Першазванага на крыжы. Існуе меркаванне, што Крыж гэты меў форму Х, настолькі распаўсюджанае, што Х-падобны крыж сталі называць «андрэеўскім». Гэтая прылада для катавання, якая пасля смерці святога стала сведкам веры, была выраблена з дрэва алівы.

Ад самага дня распяцця і да XIII стагоддзя Крыж апостала Андрэя захоўваўся ў горадзе Патры як каштоўная рэліквія. Потым ён быў перанесены на Захад і ледзь не загінуў у агні падчас Французскай рэвалюцыі 1789 года. Большая яго частка была выратаваная каталіцкім святаром, пасля чаго рэліквія захоўвалася ў кіоце, які меў форму правільнага крыжа, у манастыры ў Масаліі (Марсель). У 1980 годзе Крыж быў перададзены Рыма-Каталіцкай царквой праваслаўным горада Патры, дзе ён захоўваецца ў Новым храме, прысвечаным апосталу Андрэю.

Мноства вернікаў штодня прыходзяць да Крыжа Першазванага апостала і просяць аб дапамозе. Свяшчэннаслужыцелі і паломнікі часта бываюць сведкамі вылечвання апантаных злымі духамі. Вылечваюцца безнадзейна хворыя, многія знаходзяць выйсце са складаных жыццёвых праблем.

Крыж святога Андрэя прабудзе ў храме ў гонар Усіх Святых у Мінску да 8 гадзін раніцы 2 жніўня. Доступ да яго адкрыты ўдзень і ўначы.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



■ Ад прадзедаў...

ЯК НАС ЦЯПЕР НАЗЫВАЦЬ?

«Звязда», за што ёй асобны дзякуй, паслядоўна адстойвае народныя звычаі і традыцыі. Адна з іх — з павагай ставіцца адно да аднаго, звяртацца па імені і імені па бацьку. Але ў апошні час, ці не пераймаючы традыцыі Захаду, газета ўсё часцей ужывае зварот па прозвішчы і імені. Пры гэтым на Захадзе прымяняюць яшчэ і прыстаўкі кшталту *пан, містар, гер.* ***У нас такой прыстаўкі няма, і зварот гучыць неяк нязвыкла. Дык ці не варта прытрымлівацца ранейшага?***

Васіль КАБАЧЭЎСКІ, г. Орша

Найперш, у само пытанне трапіла вельмі распаўсюджаная памылка. Шаноўны спадар Кабачэўскі сцвярджае, што традыцыйным для беларусаў з'яўляецца так званы трохчленны зварот, адной з частак якога павінна быць імя па бацьку. Але гэта не зусім так. Да перыяду ўваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі імёны па бацьку на -іч нашымі продкамі амаль не ўжываліся. Такая традыцыя ўсталявалася ў мове толькі ў XVIII—XIX стагоддзях. Гэта падкрэсліваецца і тым, што тыповыя беларускія прозвішчы мелі і маюць такі самы канчатак *-іч*. Прывядзём да прыкладу прозвішчы вядучых стыльрэдактараў «Звязды» — *Пятровіч, Сідаровіч.*

На гэта звяртае ўвагу ў сваім даследаванні «Эпісталярны тэкст: паняцце, структура, тыпалогія» беларускі мовазнаўца, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, Сяргей ВАЖНІК: «У беларускім моўным этыкеце трохчленныя ветлівыя звароты хоць і вядомы беларусам здавён, аднак замацаваліся яны ў эпісталярнай практыцы XX ст. пад уплывам рускага этыкету. Нездарма ў беларускай мове няма аднаслоўнага эквіваленту для рускага слова «отчество». Вельмі цікавая на гэты конт агаворка была зроблена самім Купалам у лісце да С.М. Гарадзецкага (1934 г.): «Кстати, сообщи мне имя-отчество Гронского и Накорякова; по белорусской привычке — не помню».

Што ж датычыцца лакуны з «прыстаўкай», пра якую вы кажаце ў пытанні, то ў беларускай мове ёсць два адпаведнікі тому ж «містару»... Першае слова — «спадар», якое ўтварылася ад старажытнага «гаспадар». Існавалі і існуюць іншыя яго формы: спадарыня (замужняя жанчына), спадарыч (нежанаты хлопец), спадарычна (незамужняя дзяўчына), спадарства (некалькі чалавек), спадару (клічная форма). Цяпер ужываюцца пераважна словы *спадар, спадарыня і спадарства.* Узгадваюцца і словы *пан (пані, паніч, паненка, панства).* Яны з'яўляюцца архаізмамі, але шырока выкарыстоўваліся менш за сто гадоў таму тым жа Купалам у яго перапісцы. Як «спадар», так і «пан» ужываюцца разам з іменем і (або) прозвішчам.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што зварот па імені і імені па бацьку не з'яўляецца ўласнабеларускім, у адрозненне ад звароту праз словы «спадар». Такой традыцыяй пераважна карыстаецца і «Звязда».

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

■ Кватэрнае пытанне

З інтэрната — у інтэрнат

Наша сям'я жыве ў інтэрнаце ў доме вельмі старой пабудовы. Ходзяць чуткі, што яго могуць прызнаць не адпавядаючым вызначаным санітарным і тэхнічным патрабаванням, а пасля, магчыма, і знесці. Калі тое адбудзецца, якое жыллё нам павінны даць узамен займаемага?

Л. Осіпава, г. Віцебск

У адпаведнасці з п. 6 арт. 93 Жыллёвага кодэкса (увайшоў у сілу з 2 сакавіка 2013 г.), у выпадку зносу інтэрната, прызнання жылога памяшкання ў інтэрнаце не адпавядаючым вызначаным для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням і пераводу яго ў нежылое, а таксама ў выпадку, калі інтэрнат знаходзіцца ў аварыйным стане або пагражае абвалам, арганізацыя, у распараджэнні якой знаходзіцца гэты інтэрнат, павінна выдзеліць грамадзянам, якія пражываюць у інтэрнаце, жылыя памяшканні ў іншым інтэрнаце з захаваннем віду раней заключаных дагавораў найму жылога памяшкання і тэрміну яго дзеяння (калі дагавор найму жылога памяшкання быў заключаны на пэўны тэрмін).

Віктар САВІЦКІ

■ Добрая вестка

БУДЗЕ «КЛУБ БЕЛАРУСАЎ» І Ў СМАЛЕНСКУ!

Паводле апошняга перапісу насельніцтва, зробленага ў 2010 годзе, у Смаленскай вобласці пражывала больш як 12 тысяч беларусаў. Асобныя з іх займалі (і займаюць!) высокія пасады ў адміністрацыі вобласці, кіравалі прадпрыемствамі і ўстановамі, пастаянна кантактавалі паміж сабой, але ж пры гэтым (у адрозненне ад многіх іншых абласцей і краін) не мелі сваёй арганізацыі.

Для таго, каб ліквідаваць гэтае ўпушчэнне, не так даўно сустрэліся начальнік Галоўнага ўпраўлення Цэнтрабанка Расіі па Смаленскай вобласці спадар Чахуноў, дырэктар прадпрыемства «Прыёрбуд» спадар Сцяпанаў, віцэ-прэзідэнт Смаленскага банка (а «па сумяшчальніцтве» — прэзідэнт Маскоўскага клуба беларусаў) спадар Кандыба ды многія іншыя. Вынікам гэтай сустрэчы стала заснаванне новай грамадскай арганізацыі — Клуба беларусаў Смаленскага краю. Старшынёй яго абраны ўраджэнец горада Клімавічы, намеснік начальніка дэпартамента эканамічнага развіцця, інвестыцый знешнеэканамічнай дзейнасці і прадпрымальніцтва вобласці спадар Сакалоў. Менавіта яму (дарэчы, чалавеку з трыма вышэйшымі адукацыямі) землякі даручылі падрыхтаваць устаноўчыя дакументы і зарэгістраваць грамадскую арганізацыю. Уступіць у яе змогуць усе, хто мае беларускія карані.

Канферэнцыю, на якой будуць вырашаны арганізацыйныя пытанні, плануецца правесці ў верасні.

Кацярына МАЗГАНАВА.

г. Смаленск

■ Пасля пісьма

ГЭТА ТРЭБА НЕ МЁРТВЫМ...

У вёсцы Васільеўка Добрушскага раёна ў 1972 годзе адкрыты мемарыял памяці землякоў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Але названы там далёка не ўсе прозвішчы: калі параўноўваць са спісам, надрукаваным ў кнізе «Памяць» па гэтым жа раёне, то не хапае 97 чалавек. Такое ж становішча, напэўна, будзе і па іншых сельскіх Саветах, іншых раёнах і абласцях. Але так быць не павінна, — пісаў у рэдакцыю «Звязды» **спадар Ладзюкоў з Добруша.**

Ён жа паведамляў, што ўздымаў ужо гэтае пытанне, але ж пачуў, што вырашэнне яго вымагае сродкаў. «Асабіста мяне (цытуем ліст чытача) падобны адказ задаволіць не можа... Я нарадзіўся ў 1937 годзе. Помню, як фашысты расстрэльвалі і палілі нашых людзей. У вёсцы з 540 дамоў засталося толькі 28... У раёне наогул няма ніводнага населенага пункта, дзе захопнікі не расстрэльвалі б, не палілі б людзей жывымі... Нашы землякі, нашы родныя і блізкія аддалі свае жыцці, каб выратаваць нас ад фашысцкай чумы. І мы не маем права не помніць іх!» — пісаў спадар Ладзюкоў.

Як паведаміў **намеснік старшыні Добрушскага раённага выканаўчага камітэта спадар Емяльянаў,** ліст гэты разгледжаны. Помнік землякам, якія пайшлі на фронт у вёсцы Васільеўка, не знаходзіцца ў спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь і не з'яўляецца воінскім пахаваннем. Інфармацыя пра імёны людзей, не нанесеныя на мемарыяльныя пліты, патрабуе ўдакладнення. Праца па карэкціроўцы спіса праводзіцца.

І напрыканцы: фінансавыя сродкі для ўвекавечання памяці землякоў, якія пайшлі на фронт, будуць прадугледжаны пры фарміраванні раённага бюджэту на 2014 год у рамках правядзення мерапрыемстваў, прысвечаных 70-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне

ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY

■ З людзьмі і сам-насам

«...Але ж, любячы і паважаючы чужое, не прыніжай сваё»

Далібог, адзін толькі крок ад смешнага да сумнага. Дзве нашы студэнткі (і сяброўкі) падчас адпачынку — справа маладая — упадабалі двух хлопцаў-сяброў. І нават заўважылі, што гэта ўзаемна! Але...
Толькі на шосты дзень, амаль перад ад'ездам, тыя двое адважыліся падысці, загаварыць — яны пазнаёміліся... І, як і варта было чакаць, разам пашкадавалі: чаму не раней? Адзін з сяброў патлумачыў: ды, маўляў, няёмка ж было: вы ўсё з нейкім гарбатым... «Якім?» — не паверылі вушам сяброўкі. Да іх толькі потым дайшло, што хлопцы ўвесь час круціліся побач і, вядома ж, чулі, як яны казалі адна адной: «Пойдзем — гарбаты п'ем». І напраўду потым сыходзілі. Як меркавалі хлапцы — да нейкага там гарбатага...

З усіх прыгод вакол, скажам так, кубачка гарбаты гэта — самая недарэчная. Былі, вядома ж, іншыя: ці не кожны, хто ў Мінску ды іншых гарадах замаўляў (прынамсі, па-беларуску) гэты напітак, думаю, можа расказаць, як у яго перапытвалі: «Чего-чего?», як крыўдавалі: «Какие вершки? С верхом же налито!», як замест чаю прыносілі каву, як...

Надоечы ўсё па-людску было: гэта значыць, дзяўчына ў кавярні ведала і што такое гарбата, і што такое цукар... Нават што такое вяршкі! «Мне б яшчэ лыжачку», — папрасіла ў яе. Яна падала, праўда, не адразу сцяміўшы... А заадно — павінілася: вы сваёй беларускай, маўляў, так мяне «загрузілі...».

Разумею: забываюцца словы, забываецца мова, калі ёй не карыстаешся, калі яе не бачыш, не чуеш, калі на ёй не чытаеш. Але ж гэта, так бы мовіць, не пра нас: не пра супрацоўнікаў «Звязды», не пра яе падпісчыкаў, якія, дарэчы, таксама пішуць, у тым ліку — «новыя лісты пра галоўнае». «Не магу зразумець нашай абыякавасці да мовы продкаў. І вытокі яе мне бачацца менавіта ў няведанні сваёй гісторыі, сваіх каранёў. Памятаеце, як у класіка: «Мы все учились понемногу чему-нибудь и как-нибудь». Вось у тым і бяда, — піша, прынамсі, **спадарыня Ірына РУДКОЎСКАЯ з вёскі Хатынічы Ганцавіцкага раёна.** — Бо чалавеку можна дазволіць збольшага вывучыць асновы хіміі, фізікі ці матэматыкі. А вось ведаць гісторыю сваёй Бацькаўшчыны, яе літаратуру (як сродак пазнання мінуўшчыны і жыцця), на мой погляд, трэба абавязкова, і прытым глыбока. Калі б мы ўсвядомілі, які трагічны шлях прайшоў наш народ, калі б мы ведалі імёны яго слаўных сыноў і дачок, калі б зразумелі, якімі ахвярамі ўсланы той шлях, які прайшлі нашы прашчуры, мы цанілі б тое, што яны нам пакінулі. І найперш — мову. А так...

Летась, — працягвае шаноўная Ірына Міхайлаўна, — мы адзначалі юбілеі нашых класікаў Купалы, Коласа, Багдановіча — выбітных песняроў, якія праславілі нас на ўвесь свет, якія паказалі, што беларуская мова — роўная сярод роўных, а па сваёй мілагучнасці нават другая ў свеце пасля італьянскай. Нам бы ганарыцца гэтым, а мы... Мы, атрымліваецца, саромеемся. І замежнікі, бываючы ў Беларусі, не могуць даўмецца, чаму гэта мы не любім яе, чаму не карыстаемся... Хтосьці можа западозрыць мяне ў нелюбові да мовы рускай. Божа барані! Я ўсё сваё жыццё выкладала яе ў школе, а рускую літаратуру XIX стагоддзя лічу першай у сусветнай літаратуры. Бясконца люблю многіх расійскіх паэтаў і пісьменнікаў, перачытваю іх і зараз. Але ж, любячы і паважаючы чужое, не прыніжаю сваё: у жыцці ўвесь час карыстаюся мовай, якую засвоіла з малаком маці».

У гэтым сэнсе вельмі паказальны ліст пошта прынесла з Карэліччыны. «Усё сваё свядомае жыццё я пражыў з газетай «Звязда», — піша **спадар Мікалай БАБАРЫКА.** — Адкуль тое пайшло? Ад бацькі. Ён служыў у пана, мала зарабляў, і жылі мы бедна, але газету паважалі. Я стаў яе чытаць, як толькі пазнаў грамату. І чытаў проста са сцяны, бо «Звяздой» ад беднасці былі паклеены сцены ў хаце».

Далей у жыцці нашага шаноўнага чытача была вайна, якая забрала бацьку, гаротнае сіроцкае дзяцінства, уступленне ў калгас, служба ў войску, праца на зямлі. Даслоўна: «Як камуніста, мяне прымушалі тады выпісваць «Правду», іншыя газеты, але я паранейшаму знаходзіў грошы на «Звязду»...

Скажаце, ліст як ліст, што ў ім такога дзіўнага, а тым больш «паказальнага»?

Патлумачу: напісаны ён (што, крый Божа, не папрок — чалавеку дзявяты дзясятак!) пераважна рускімі словамі, аднак літарка і — праз увесь тэкст — наша, беларуская, з кропачкай. Адкуль яна, такая «трывушчая»?

Магчыма, са школы? Магчыма — са «Звязды», якой была абклеена хата, магчыма — з сям'і?

«Сваю матулю я амаль не помню: яна памерла, калі мне было два гады. Бацька загінуў у партызанах. Так што «даброт» дзіцячага дома я пазбег дзякуючы бабулі — Аляксандры Тарасаўне. Ад яе ж — веданне роднай мовы», — прызнаецца **спадар Уладзімір МАСАЛКОЎ з Віцебска.**

І з той жа «крыніцы», відаць, любоў, бо цягам некалькіх дзесяцігоддзяў (!) наш пастаянны падпісчык жыў і працаваў у рускамоўным асяроддзі, далёка за межамі Беларусі, але і там заўсёды атрымліваў па пошце беларускія выданні — газету «Чырвоная змена», часопіс «Маладосць». Гэта (як прызнаецца Уладзімір Мікалаевіч) яднала яго з Радзімай, гэта дазваляла помніць мову, якую цяпер — ён перакананы — трэба ратаваць.

Бо... «На беларускім тэлебачанні з'явіўся тэлеканал «БТ-3». Анансавалі яго загадзя, казалі і пісалі, што ён будзе беларускамоўны. Аднак тэлевядучыя (нават праграм, прысвечаных нашым славутым пісьменнікам, грамадскім дзеячам, помнікам нацыянальнай культуры і г.д.) часам размаўляюць па-руску. Атрымліваецца, што бракуе беларускамоўных журналістаў? Гэта, па-першае. Па-другое, мусіць, не толькі мне, — піша Уладзімір Мікалаевіч, — патрэбны і падабаюцца «Навіны надвор'я». Цяпер неад'емнай часткай праграмы стала сустрэча з так званым госцем. Аднак хто адкажа, чаму, па якой прычыне пытанні гэтым гасцям трэба задаваць па-руску? Калі б яны прыязджалі да нас з Германіі або Турцыі, было б яшчэ зразумела. Але ж звычайна тымі гасцямі з'яўляюцца грамадзяне Беларусі. А для іх веданне і карыстанне абедзвюма дзяржаўнымі мовамі, прычым на аднолькавым узроўні, з'яўляецца абавязковым»...

«Дарэчы, — зазначае чытач, — некаторыя з гэтых гасцей размаўляюць з яўна выражаным беларускім акцэнтам, нярэдка — з элементамі «трасянкі», ды і руская ў іх — далёкая ад дасканаласці. Тады навошта?..»

Ёсць у лісце і па-трэцяе: «Быў час — спартыўныя каментатары праявілі добрую ініцыятыву — сталі весці рэпартажы аб спаборніцтвах на беларускай, і вельмі прыстойнай, мове. Аднак пачын чамусьці скончыўся»...

У лісце **спадара Анатоля КАНСТАНЦІНАВА** (дарэчы, украінца, які з 1961 года жыве ў Мінску і пастаянна чытае «Звязду») прыклады іншага кшталту. «Так, дзяржаўных моў у Беларусі дзве, — піша ён, — аднак першай у Канстытуцыі краіны названа беларуская. Гэта заканамерна, бо менавіта яна з'яўляецца мовай тытульнай нацыі і менавіта яна дала назву дзяржаве. Як на мой погляд, дык адсюль вынікае, што шыльды ўсіх устаноў і прадпрыемстваў павінны быць напісаны ў першую чаргу па-беларуску. Як, напрыклад, Мінскі падшыпнікавы завод, Мінскі завод колавых цягачоў... Пакуль жа абсалютная большасць шыльдаў і ў сталіцы, і далёка за яе межамі зроблены якраз наадварот — найперш па-руску.

Мова тытульнай нацыі рэдка сустракаецца і ў назвах гандлёвых пунктаў, клубаў, кінатэатраў, кавярняў... Ну вось, напрыклад, — працягвае спадар Анатоль, — задаўся я пытаннем, чаму абутковая крама непадалёк ад чыгуначнага вакзала называецца «Basta»? (У перакладзе з італьянскай гэта слова азначае «хопіць».) Як патлумачылі прадаўцы (сам ніколі не здагадаўся б!), хопіць, маўляў, шукаць абутак у іншых крамах — усё прадаецца тут! Але ж хіба ў беларускай мове бракуе слоў, каб выказаць падобную думку?

Альбо вось яшчэ адна абутковая крама — «О'кей!», хоць беларускія словы «Шык!», «Цуд!», «Самае тое!» сэнсу, на мой погляд, адпавядаюць больш, да таго ж перадаюць мясцовы каларыт і той самы смак беларускай мовы. Туды ж і назвы гіпермаркетаў. Мне кажуць, «Биггз» — гэта агромністы, вялізны, велізарны... Баюся, дзясяткі тысяч людзей, праязджаючы міма, могуць пра тое толькі здагадвацца! А вось напісалі б па-беларуску — і ўсе зразумелі б, бо гэтак было б бліжэй.

Аналагічна і з назвай «Гиппо».

Чую пярэчанні, — зазначае чытач, — маўляў, гэтыя гіганты пабудавалі інвестары, і яны, уклаўшы свае грошы, маюць права даваць сваім аб'ектам свае імёны. Згодзен. Але ж наўрад ці тыя інвестары былі б супраць яшчэ і беларускамоўных варыянтаў назвы? Прынамсі, крамы сеткі «Тропинка» пазнаёмілі б гасцей краіны з беларускім словам «Сцяжынка», а «Родная сторона» загучала б, магчыма, як «Родны кут». Але ж ці гаварыў ім хто-небудзь пра гэта?

Далей: у сталіцы на галоўнай магістралі ёсць клуб «Гудвин». Ён, гэты герой, зроблены з металічных канструкцый, сустракае гасцей на ўваходзе. Добра, здавалася б? Але ж персанаж, так бы мовіць, не наш, з чужой казкі. А што ж беларускія? Яны хіба горшыя?»

На гэтым назіранні ў нашага чытача не канчаюцца. «Упрыгожылі сталіцу, — зазначае спадар Канстанцінаў, — кавярні «Васількі», а вось кавярня «Белочка» магла б стаць «Вавёрачкай». Ёсць у горадзе кавярня «Габрово». Але ж не горшыя гумарысты жывуць у Аўцюках. Там таксама ладзяцца фестывалі народнага гумару, адкрыты яго музей... Дык чаму б у Мінску не арганізаваць нейкі клуб ці кавярню з гэтакай назвай, чаму б не ладзіць там сустрэчы з беларускімі гумарыстамі? Думаецца, што адкрывальнік Аўцюкоў, вядомы пісьменнік Уладзімір Ліпскі, вітаў бы такую ідэю.

Ці вось яшчэ. Ёсць у нашай сталіцы кавярня «Битлз». Нічога не скажаш: папулярны быў гурт! Але ж у Беларусі ёсць свой улюбёны песенны калектыў, прычым вядомы вельмі даўно і далёка за межамі. Дык чаму б нейкі рэстаран ці кавярню не назваць у гонар «Песняроў»? Падышлі б для гэтага і назвы найлепшых беларускіх песень — «Купалінка», «Рэчанька», «Толькі з табою», «Зорка Венера», «Вярба»... Такім чынам, — падсумоўвае чытач, — мінчане, і госці нашай сталіцы бачылі б, што яны менавіта ў Беларусі, што гэта — асобная краіна са сваім гімнам, са сваім сцягам, са сваёй мовай»...

Паказваць гэта і напраўду ёсць каму: да нас, у краіну едуць турысты — едуць зараз. А наперадзе ж — чэмпіянат свету па хакеі. «Мінск, Беларусь рыхтуецца да яго даўно. І ў мяне асабіста, — піша **спадар Аляксандр ПЯТРУННІКАЎ з Санкт-Пецярбурга,** — няма сумненняў, што ў арганізацыйным плане будзе зроблена ўсё! Але ж адзін і вельмі важны кірунак варты большай увагі. Турысты, шматлікія госці, якія прыедуць на чэмпіянат, будуць шукаць беларускую мову, будуць шукаць нешта адметнае, каб завезці дадому, на радзіму. Павышаны попыт, думаю, будзе на цукеркі і іншыя прысмакі, на рэчы з лёну, на сувеніры, на піва і гарэлку... І шкада, што надпісы на іх вельмі часта даюцца па-руску. Госці чэмпіянату гэтага, баюся, не зразумеюць. Чаму так мяркую? Таму што сам і далёка не аднойчы з Гомельшчыны прывозіў гасцінцы. Сярод іх была, вядома ж, і пляшка-другая гарэлкі. Дык вось: усе, каго я браўся ёю частаваць, адразу ж пачыналі разглядваць этыкеткі. А пасля на поўным сур'ёзе пыталі ў мяне: а ці праўда, што прывёз з Беларусі?.. Трэба, на мой погляд, каб гэта было бачна адразу, здалёк».

...Вось такія лісты, такія думкі. З нейкімі з іх можна пагадзіцца, з нейкімі, можа, паспрачацца, нейкія, што называецца, «узяць на ўзбраенне» — пакуль не позна. Бо, паводле даведніка «Этнолог», у свеце больш за 6800 моў і дыялектаў. Згодна з прагнозамі вучоных, цягам бліжэйшых ста гадоў 80—90 працэнтаў іх знікнуць. Мы сваю яшчэ можам абараніць, калі будзем размаўляць па-беларуску і гэтаму ж вучыць дзяцей, калі будзем чытаць (дарэчы, цуд, якія выходзяць кнігі! Ды і газеты...), калі будзем пісаць... У тым ліку і лісты — у сваю газету.

Валянціна ДОЎНАР

ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY